■ На скрыжаваннях лёсу

# КАЛІ ВЫ ПОБАЧ, ПРАБЛЕМ НІБЫТА І НЯМА



У зале музея.

## Дзякуючы педагогам школа-інтэрнат стала важным і светлым перыядам у жыцці цэлага пакалення

**Пасля вызвалення сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у мястэчку Узда, што на Міншчыне, 15 ліпеня 1944 года быў створаны спецыяльны дзіцячы дом для дзяцей палеглых воінаў і партызанаў. Сюды звозілі сірот з усіх куткоў Савецкага Саюза. Многія з іх перажылі шмат жахаў і пакут ваеннага ліхалецця, прайшлі канцэнтрацыйныя лагеры, гестапа. І толькі тут, у дзіцячым доме, іх заледзянелыя душы змаглі адагрэць выхавальнікі сваёй цеплынёй, клопатам, бясконцым цярпеннем. Не выпадкова дзеці іх успрымалі як родных бацькоў. Многія з малых не памяталі, хто яны, і бралі прозвішчы сваіх настаўнікаў. А першым дырэктарам стаў Пётр Васільевіч Козел. З фотаздымка, што ў школьным музеі, глядзіць чалавек з глыбокімі вачыма, якія літаральна выпраменьваюць дабрыню і святло. Тут жа і пасведчанне байца партызанскага атрада імя Катоўскага брыгады Варашылава, якая дзейнічала на тэрыторыі Уздзенскага, Дзяржынскага і Нясвіжскага раёнаў.**

— Работа па стварэнні музея пачалася ў 1994 годзе, а ў 2009-м адкрыта новая экспазіцыя. Кожны экспанат адлюстроўвае не толькі гісторыю школы, але і цэлую пасляваенную эпоху да нашых дзён, — расказала настаўніца, а па сумяшчальніцтве **загадчыца музея Іна ЗАХАРАВА**. — У нас шмат унікальных прадметаў. Вось кніга загадаў па Уздзенскім дзіцячым доме, датаваная 1944 годам. Кранаюць да слёз запісы аб тым, як заахвочвалі дзяцей у тыя далёкія часы на выдатную вучобу і прыкладныя паводзіны. Ім дарылі адрэзы тканіны для пашыву прыгожай сукенкі, кашулі, а яшчэ 150 г пернікаў і 100 г цукерак. А вось гэты сшытак быў знойдзены ў нямецкай камендатуры мястэчка. У пасляваенныя гады папера была вялікім дэфіцытам. Таму яго не выкінулі, а выкарысталі як кнігу руху дзяцей па Уздзенскім дзіцячым доме ў 1944 годзе. Тут вёўся спіс выхаванцаў, якія першымі паступалі ва ўстанову. За кожным прозвішчам — глыбокая трагедыя.

...Валянціна Война рана засталася сіратой. У 1937 годзе бацька дзяўчынкі быў арыштаваны і расстраляны, маці памерла пры нараджэнні чацвёртага дзіцяці. Унукі засталіся з бабуляй. Афіцэр НКУС, пашкадаваўшы малых, параіў старой раскідаць іх у чужыя сем'і па розных населеных пунктах. Валя апынулася ў вёсцы Астравок, якая ў гады вайны была спалена. Цудам дзяўчынцы ўдалося ўцячы ў лес. Дачакаўшыся, пакуль карнікі пакінулі вёску, яна выйшла на дарогу....

Ва Уздзенскім дзіцячым доме яна была старанлай вучаніцай, закончыла Пінскае педагагічнае вучылішча, а затым — філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Заслужаная настаўніца БССР вучыла і дачку Васіля Емяльянавіча Куцанава, які ўзначальваў дзіцячы дом у 1944—1947 гадах, — Ларысу. Дзяўчына стала жонкай вядомага кампазітара, народнага артыста СССР Яўгена Глебава. У 2010 годзе Ларыса Васільеўна выдала кнігу «Яўген Глебаў. Лёсу сярэбраныя струны». Адзін з раздзелаў прысвечаны дзіцячаму дому.

Валянцін Холад — Герой Савецкага Саюза, камандзір атамнай падводнай лодкі, контр-адмірал жыве ў Санкт-Пецярбургу. На грудзях яго жонкі Жанны Мікалаеўны, што глядзіць з фотаздымка, незвычайны медаль. Такую самаробную ўзнагароду «зацвердзілі» афіцэры-падводнікі для сваіх верных спадарожніц у знак удзячнасці за тое, што пераносяць з імі ўсе цяжкасці службы...

— Другі перыяд установы пачаўся ў 1959 годзе, калі на базе спецыяльнага дзіцячага дома была створана сярэдняя агульнаадукацыйная школа-інтэрнат. Дырэктарам яе прызначылі Мікалая Бардовіча. Мікалай Маісеевіч стаў легендай Мінскай вобласці. Менавіта дзякуючы яму тут быў створаны цудоўны калектыў педагогаў-аднадумцаў, якія давалі вучням вельмі моцныя веды, — працягвае Іна Захарава. — Гэтыя людзі замянілі дзецям бацькоў, добрых, мудрых, клапатлівых, і далі кожнаму пуцёўку ў дарослае жыццё. Нашы выпускнікі заўсёды паступалі ў самыя прэстыжныя навучальныя ўстановы былога Савецкага Саюза.



РСФСР
НАРОДНЫЙ КОМИССАРИАТ ПРОСВЕЩЕНИЯ
ПОХВАЛЬНАЯ ГРАМОТА
ЗА ОТЛИЧНЫЕ УСПЕХИ И ПРИМЕРНОЕ ПОВЕДЕНИЕ

Пахвальная грамата 1939 года выхаванкі дзіцячага дома Марыі Жыгачовай.

У 1993 годзе навучальная ўстанова стала санаторнай школай-інтэрнатам для дзяцей з зон радыяцыйнага забруджвання. Яе ўзначаліла заслужаная настаўніца, выдатніца адукацыі Беларусі Людміла Іванаўна Камашэнкава. Сёння гэта санаторная школа-інтэрнат для дзяцей з саматычнай паталогіяй. Кожную чвэрць тут лечацца і праходзяць аздараўленне 160 хлопчыкаў і дзяўчатак Міншчыны, у тым ліку з няпоўных, малазабяспечаных, неўладкаваных сям'яў, сіроты. Выхаванцы тут папраўляюцца, дужэюць, і, бясспрэчна, выхавальнікі робяць усё неабходнае, каб дзеці развіваліся духоўна і інтэлектуальна, раслі патрыётамі. Да іх наведваюцца курсанты і афіцэры ваеннай акадэміі, ветэраны вайны. Штогод у школе арганізуецца дзень музея, які з нецярпеннем чакаюць вучні, паколькі да іх прыязджаюць супрацоўнікі кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл са сваімі гадаванцамі з паказальнымі выступленнямі. А шэфы з 15-й зенітнай брыгады горада Фаніпаля частуюць усіх ахвотных салдацкай кашай, прыгатаванай у палявой кухні. З задавальненнем выступаюць перад дзіцячай аўдыторыяй зоркі беларускай эстрады. На стэндах музея фотаздымкі «Сяброў», Ірыны Дарафеевай, Сашы Нэма, групы «Да Вінчы», ансамбля «Бясeда».

Даглядаюць школьнікі і Алею памяці педагогаў. За кожным дрэўцам замацаваны вучні пэўнага класа. Вось дрэва ў памяць настаўніка Адама Якаўлевіча Александровіча. Ён захапляўся краязнаўствам, выхоўваў у дзяцей любоў да роднага краю. На алеі ёсць дрэва і ў гонар сямейнай дынастыі Міронычыкаў — Анатоля Пятровіча і яго жонкі, Леаніды Міхайлаўны. Пра яе нехта з вучняў сказаў: «Калі вы побач з намі, праблем нібыта і няма»...



Ваза «Юбілейная», зробленая выпускнікамі 1971 года, адлюстроўвае дасягненні краіны за 50 гадоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

**Фота з архіва музея**

■ Чулі?

# У МІРЫ ЗНОЙДЗЕНЫ БУДЫНАК, ЯКОГА НЯМА НА КАРТАХ



**Фрагменты будынка канца XVI—пачатку XVII стагоддзя былі знойдзены падчас археалагічных раскопак на тэрыторыі музея «Палацавы комплекс «Мір». Пра ўнікальную знаходку праінфармавалі старшыню Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА.**



Уладзімір ГУСАКОЎ знаёміцца з археалагічнымі знаходкамі.

У Карэліцкім раёне побач з Мірскім замкам упершыню праводзяцца археалагічныя пошукі на месцы, дзе калісьці быў размешчаны палац Святаполк-Мірскіх канца XIX стагоддзя. Работы вядуцца пад кіраўніцтвам старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірыны Ганецкай.

У працэсе раскопак быў выяўлены цэлы шэраг важных археалагічных знаходак. Так, вышэйзгаданага будынка XVI—XVII стагоддзяў няма ні на адной гістарычнай карце. Археолагамі былі знойдзены фрагменты кафлі, чарапіцы, сталовай керамікі, а таксама «цагліна-пальчатка», якая датуецца XVI—XVII стагоддзямі.

Расчышчаны падмурак дома XIX стагоддзя, які належаў домакіраўніку, а таксама лесвіца. Ірына Ганецкая лічыць, што гэтая лесвіца, па ўсёй верагоднасці, знаходзілася ўнутры памяшкання. «Мяркуючы па планах будынка пачатку XX стагоддзя, палац быў крыжападобнай сіметрычнай формы: галоўны корпус выцягнуты, а з двух бакоў — прыбудовы. Дык вось гэтая лесвіца, хутчэй за ўсё, і з'яўляецца часткай адной з іх», — патлумачыла яна. Пазні палац Святаполк-Мірскіх вырас, як цяпер высветлілася, на больш старажытным падмурку.

Падчас знаёмства з вынікамі археалагічных раскопак старшыня прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў падкрэсліў важнасць археалагічных работ, што праводзяцца, і іх значэнне для захавання гісторыі і культурнай спадчыны беларускага народа.

Названыя археалагічныя работы з'яўляюцца першым крокам у рэалізацыі Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і музеем «Палацавы комплекс «Мір». Дакумент быў падпісаны ў снежні 2015 года. На цяперашні момант археолагамі вывучана тэрыторыя больш чым у 200 квадратных метраў.

«Замкавы комплекс «Мір»— унікальны помнік нацыянальнай культуры Беларусі. У 2000 годзе Мірскі замак быў уключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*